**2 снежня 2022 г. - 60 гадоў з часу стварэння КОБРЫНСКАЙ ПТУШКАФАБРЫКІ (цяпер – ААТ «Кобрынская птушкафабрыка»; 1962)**



**Кобрынская птушкафабрыка** - адно са старэйшых птушкагадоўчых прадпрыемстваў Рэспублікі Беларусь, даволі вядомае на абшарах былога Савецкага Саюза.

Заснавана 2 снежня 1962 года на базе інкубацыйна-племяннной станцыі і калгаса «Расія» на падставе распараджэння Савета Міністраў БССР № 1436 ад 14 снежня 1962 года. Першым дырэктарам птушкафабрыкі быў Захар Абрамавіч Шухман. Напачатку было тры птушнікі і два прыстасаваныя куратнікі. Налічвалася 28,7 тысяч курэй-нясушак. Птушка ўтрымлівалася на падлозе, усе працэсы выконваліся ўручную. Неўзабаве пачалі прымяняць драўляныя клеткі.

У 1965 годзе разгарнулася будаўніцтва новых птушкагадоўчых памяшканняў, у 1967 годзе прыступілі да рэканструкцыі старых пабудоў. Для працаўнікоў фабрыкі быў пабудаваны пасёлак Птушкафабрыка, які ўваходзіць у Батчынскі сельсавет. На 2019 годзе ў пасёлку 650 жыхароў.

З 1970 года фабрыка поўнасцю перайшла на прагрэсіўнае падлогавае ўтрыманне птушкі. Планамернае ўдасканаленне вытворчасці, добрасумленная работа людзей забяспечылі значны рост паказчыкаў. У 1973 годзе пагалоўе курэй-нясушак ужо склала 150 тысяч, атрымана 32,8 мільёна штук яек і 380 тон мяса птушкі.

Птушкафабрыка неаднаразова займала прызавыя месцы ва Усесаюзных сацыялістычных спаборніцтвах. Тагачасная праектная магутнасць фабрыкі — вытворчасць больш як 300 тысяч яек у суткі, менавіта столькі прадукцыі выходзіла тут з канвеера. Працоўны калектыў налічваў 225 чалавек.

Працоўныя поспехі шэрагу работнікаў фабрыкі адзначаны ўзнагародамі. Ганна Сяргееўна Камялееўская ўзнагароджана ордэнамі Леніна (1971), Працоўнага Чырвонага Сцяга (1975). Любоў Лаўрэнцьеўна Казак атрымала ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга, была абрана дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР.

З сярэдзіны 1980-х дырэктарам фабрыкі быў Віктар Іосіфавіч Тарасевіч, які ўзнагароджаны медалём «За трудовую доблесть». З 1989 года Кобрынская птушкафабрыка ў складзе

Баранавіцкага вытворчага аб'яднання, з 1993 г. – у падпарадкаванні РА «Белптушкапрам». Працавалі каля 500 чалавек.

У 2001 годзе да фабрыкі далучылі сельскія гаспадаркі Кобрынскага раёна «1 Мая» і «Патрыкі», што значна пашырыла ўласныя сельскагаспадарчыя ўгоддзі птушкафабрыкі. Пасля далучэння да птушкафабрыкі калгасаў колькасць працуючых узрасла амаль да 700 чалавек. З 17 снежня 2001 года птушкафабрыка «Кобрынская» перайменавана ў РУСВП «Кобрынская птушкафабрыка». 22 лютага 2005 года РУСВП «Кобрынская птушкафабрыка» пераўтворана ў адкрытае акцыянернае таварыства (загад Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь ад 31.12.2004 г. № 227).

Асноўныя кірункі дзейнасці птушкафабрыкі - вытворчасць і рэалізацыя яек, мяса птушкі, яечнага меланжу і бялку, каўбасных вырабаў, паўфабрыкатаў і кансерваў з мяса птушкі, вытворчасць травяной мукі, сухіх бялковых кармоў. Мае фірменныя магазіны, свой машынна-трактарны парк.

Аднак ішоў час, і недаравальныя памылкі і пралікі значна падарвалі былую славу прадпрыемства. Прыйшла ў заняпад сістэма збыту, былі страчаны добрыя партнёрскія сувязі з камбікормавымі заводамі і г.д. У 2011 годзе для стабілізацыі фінансава-эканамічнага становішча Кобрынская птушка-фабрыка далучана да ААТ «Баранавіцкая птушкафабрыка», каб у далейшым стварыць сумесны холдынг з удзелам усіх птушкафабрык Брэсцкай вобласці. Перавага холдынга ў тым, што ліквідуецца канкурэнцыя паміж фабрыкамі, паколькі выпрацоўваецца адзіная для ўсіх стратэгія. Прадпрыемства, якое, па сутнасці, прыйшло ў заняпад, дзякуючы актыўнай падтрымцы мясцовай улады, комплекснаму падыходу да вырашэння наспелых задач, а таксама веры і энергіі людзей, якія па-сапраўднаму хварэюць за даручаную справу, за даволі кароткі тэрмін не толькі вярнула страчаныя пазіцыі, але і стала актыўна і паступальна развівацца далей, дамагаючыся новых поспехаў.

У 2015 годзе ў адносінах да птушкафабрыкі эканамічны суд вобласці адкрыў конкурсную вытворчасць па справе аб банкруцтве. Гэта не стала прыгаворам для прадпрыемства - птушкафабрыка працавала ва ўмовах фінансавага аздараўлення. Сёння Кобрынская птушкафабрыка - паказальны прыклад своечасовага ўваходу ў працэдуру

банкруцтва і аздараўлення сельгаспрадпрыемства. Гэта прыватнае гандлёвае ўнітарнае прадпрыемства «МРПи», названае ў далейшым «Крэдытор» у асобе кіраўніка Індывідуальнага прадпрымальніка Івана Ільіча Ідэльчука (дагавор перадачы паўнамоцтваў ад 01.07.2015).

Матэрыял падрыхтаваны ў 2022 г. Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф І кат. аддзела абслугоўвання і інфармацыі


**Кобринская птицефабрика** // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 465-466.

**Кобринская птицефабрика** // Белорусская ССР : краткая энциклопедия : в 5 т. - Минск, 1979. - Т. 2. - С. 285.

**Кобрынская птушкафабрыка** // Беларуская ССР : кароткая энцыклапедыя : у 5 т. - Мінск, 1979. - Т. 2. - С. 348.

**Птушкафабрыка** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4. - С. 181.

**Птушкафабрыка «Кобрынская»** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 409.

**Камялеўская Ганна Сяргееўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 427.

**Мы строим Брестчину** / [Н. В. Митюкова и др. ; редколлегия: С. Н. Лободинский и др. ; фото : В. В. Король, А. И. Шульгач]. - Брест : Брестская типография, 2019. - 367 с.

См. с. 47.

**Традыцыі жывёлагадоўлі Беларусі** / [Г. І. Каспяровіч і інш. ; навуковы рэдактар Г. І. Каспяровіч] ; Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы. - Мінск : Беларуская навука, 2019. - 465, [2] с.

Гл. с. 271.

**Адкрытаму акцыянернаму таварыству «Кобрынская птушка-фабрыка» (1962) - 60 гадоў з часу стварэння** // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная

раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2020. - С. 64.

**Глушкова, Т**. Просто быть лидером / [Тамара Глушкова ; беседовала] Ксения Зарецкая // Кобрынскі веснік. - 2020. — 9 верасня (№ 70). — С. 4 : фот.

Беседа с руководителем первичной организации БРСМ ОАО «Кобринская птицефабрика» Т. Глушковой.

**Какие** яйца лучше? // Комсомольская првда. - 2019. — 12 октября. — С. 8.

ОАО «Кобринская птицефабрика» - одно из старейших белорусских предприятий птицеводческой отрасли.

**Бакун, Е**. Хлеб в награду за знания / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2018. — 17 лістапада. — С. 9.

Агроном ОАО «Кобринская птицефабрика» О. Батуля — человек любящий и уважающий землю-кормилицу.

**Символ** Пасхи должен быть самым красивым! // Комсомольская правда. - 2018. — 6 апреля. — С. 9.

ОАО «Кобринская птицефабрика» является одним из старейших предприятий птицеводческой отрасли.

**Бялоў, Д.** Лепшы падарунак — добры ураджай / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2017. — 13 снежня. — С. 1.

У ААТ «Кобрынская птушкафабрыка» закладваюцца падставы да новага ўраджаю.

**Германович, И**. Куры Кобринской птицефабрики-банкрота снесли прибыль / Ирина Германович // Сельская газета. - 2017. — 24 августа. — С. 7.

Кобринская птицефабрика — показательный пример своевременного входа в процедуру банкротства и оздоровления сельхозпредприятия.

**Шевко, А.** Банкротство - еще не приговор / Александр Шевко // Сельская газета. - 2016. — 29 сентября. — С. 4.

Работа Кобринской птицефабрики в период финансового оздоровления.

**Жук, Е.** Крах «птичьего» производства / Елена Жук // Вечерний Брест. - 2015. — 6 марта. — С. 2.

В отношении птицефабрики экономический суд области открыл конкурсное производство по делу о банкротстве.

**Пашкович, Л.** С любимым делом по жизни / Людмила Пашкович ; фото автора // Кобрынскі веснік. - 2015.— 13 чэрвеня. — С. 9.

Главный агроном ОАО «Кобринская птицефабрика» А. Штык молод, полон идей и любит свою работу.

**Мельнік, Р.** Моладзь з гонарам працуе на жніве / Раман Мельнік ; фота аўтара // Кобрынскі веснік. - 2013.— 17 жніўня. — С. 1.

Маладзёжны экіпаж ААТ «Кобрынская птушкафабрыка» стала лідарам у раённым спаборніцтве сярод маладзёжных экіпажаў.

**Пашкович, Л.** Энергозатраты снижаются / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2013. — 2 лістапада. — С.4.

Вопросы экономии и бережливости в ОАО «Кобринская птицефабрика».

**Рекуц, С.** Птицефабрика «несется» на столичный рынок / Сергей Рекуц ; фото Валерия Короля // Заря. - 2013.— 25 июля.— С. 6.

ОАО «Кобринская птицефабрика» успешно теснит конкурентов на минском рынке за счет высокой рентабельности яиц.

**Жук, Е**. Революция для несушек / Елена Жук // Вечерний Брест. - 2012. - 22 февраля. - С. 13.

Кобринская птицефабрика на новом этапе развития.

**Кондрашук, Н.** Кобринской птицефабрике - 50 / Н. Кондрашук // Кобрин-информ. - 2012. - 6 декабря. - С. 2.

**Максимчик, А**. Шансы на оздоровление и стабильность / Алексей Максимчик // Кобрынскі веснік. - 2012. - 22 лютага. - С. 1. ; Кобрин-информ. - 2012. - 23 февраля. - С. 4.

Коллектив кобринской птицефабрики посетил Председатель Высшего Хозяйственного Суда Республики Беларусь В. Каменков.

**Мельнік, Р.** Віншаванні ад шчырага сэрца / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2012. - 25 лютага. - С. 1.

Урачысты сход ветэранаў прайшоў у актавай зале ААТ «Кобрынская птушкафабрыка».

**Мельнік, Р.** Каб рацыён быў збалансаваным / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2012. - 11 ліпеня. - С. 1.

Калектыў птушкафабрыкі мяркуе стварыць запас кармоў уласнай вытворчасці.

**Місюк, Д.** Птушкафабрыка: за крок да холдынга / Дзмітрый Місюк , гутарыў Ігар Федаровіч // Кобрынскі веснік. - 2012. - 11 лютага. - С. 1,2.

На базе Кобрынскай і Баранавіцкай птушкафабрык будзе створаны холдынг.

**Палескі, Я.** Годная праца / Ян Палескі // Кобрынскі веснік. - 2012. - 23 мая. - С. 2.

У актыўным рытме працуюць работнікі сартавальнага ўчастка Кобрынскай птушкафабрыкі.

**Палескі, Я.** Фірменны почырк / Ян Палескі // Кобрынскі веснік. - 2012. - 17 сакавіка. - С. 4.

Аб фірменным магазіне кобрынскай птушкафабрыкі.

**Савчук, М.** Кобринская птицефабрика / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2012. - 2 февраля. - С. 2.

Фабрику посетил заместитель главы Администрации Президента Республики Беларусь А. Н. Тур.

**Сергеев, И**. Не на птичьих правах / Иван Сергеев // Заря. - 2012. - 23 февраля. - С. 2.

Завершилось объединение кобринской птицефабрики с барановичским предприятием.

**Сідарук, І.** Алгарытм поспеху / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2012. - 1 снежня. - С. 4.

Кобрынскай птушкафабрыцы – 50 гадоў.

**Сідарук, І.** Вяртаецца былая слава / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2012. - 17 лістапада. - С. 3.

ААТ «Кобрынская птушкафабрыка» наладзіла стабільную і паспяховую дзейнасць.

**Курец, А.** Совершенству не бывает предела / Александр Курец // Белорусская нива. - 2010. - 21августа. - С. 5.

**Мельнік, Р.** Лепшы маладзёжны экіпаж раёна / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2011. - 17 жніўня. - С. 1.

На сёлетнім жніве вызначаны маладзёжны экіпаж ААТ «Кобрынская птушкафабрыка».

**Савчук, М**. Сколько проблем в миллионе яиц? / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2011. - 8 декабря. – С. 2.

О том, как кобринская птицефабрика выходит из кризиса.

**Сергута, Д**. М.Сколько проблем в миллионе яиц / Д. М. Сергута ; [записала] Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2010. - 30 сентября. - С. 2.

Интервью с новым руководителем кобринской птицефабрики.

**Сыцін, А.** На новы ўзровень развіцця / Аляксандр Сыцін // Кобрынскі веснік. - 2010. - 11 верасня. - С. 3.

Кобрынская птушкафабрыка.

**Белуга, В.** Не курицей единой / Вячеслав Белуга // Рэспубліка. - 2009. - 23 красавіка. - С. 4.

**Больше** витаминов // Заря. - 2009. - 12 февраля. - С. 2.

Кобринская птицефабрика планирует наладить выпуск яиц, обогащённых витаминами.

**«Гусиный** проект» работает // Заря. - 2009. - 19 мая. - С. 2.

Гусиное мясо начала производить Кобринская птицефабрика.

**Кобрынская** птушкафабрыка // Звязда. - 2009. - 16 мая. - С. 3.

Кобрынская птушкафабрыка наладзіла выпуск гусінага мяса.

**Козлович, В.** Гусиный паштет / Валентина Козлович // Советская Белоруссия. - 2009. - 25 августа. - С. 6.

Проблема разведения гусей на ОАО «Кобринская птицефабрика».

**Муха, Ф**. Гусь по-кобрински / Фёдор Муха // Рэспубліка. - 2009. - 17 лютага. - С. 5.

**Сацук, А**. Гусь - птица выгодная / Алексей Сацук // Кобрынскі веснік. - 2008. - 5 красавіка. - С. 2.

На Кобринской птицефабрике занялись выращиванием гусей.

**Строцкая, Г.** Яйца кобринских несушек «личиком» не вышли? / Галина Строцкая // Беларускі час. - 2008. - 31 октября. - 6 ноября. - С. 5.

Кобринская птицефабрика в числе прочих угодила в черный список Россельхознадзора.

**Максимчик, А**. На конвейере - витаминные гранулы / Алексей Максимчик // Кобрынскі веснік. - 2007. - 6 чэрвеня. - С. 2.

Кормовая база птицефабрики.

**Пянко, А**. Ферма для гуся / Алексей Пянко // Кобрынскі веснік. - 2007. - 14 красавіка. - С. 2.

На Кобринской птицефабрике появилась гусиная ферма.

**Пянко, А**. Главное направление - техперевооружение / Алексей Пянко // Кобрынскі веснік. - 2006. – 18 лістапада. – С. 2.

**Пянко, А.** Каждый год приносит доход / Алексей Пянко // Кобрынскі веснік. - 2005. – 19 лістапада. – С. 2.

**Пянко, А.** Системный подход – весомый доход / Алексей Пянко // Кобрынскі веснік. - 2005. – 16 ліпеня. – С. 1-2.

**Савчук, М**. Необычные свойства обычных яиц / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. – 2005. – 13 января. – С. 2.

Новая продукция Кобринской птицефабрики - пищевые йодоселеносодержащие куриные яйца.

**Муха, Ф.** Не золотые, но не простые яйца несут куры на Кобринской фабрике / Федор Муха // Рэспубліка. – 2004. – 9 снежня. – С. 2.

**Пянко, А.** Курс на тэхнічнае пераўзбраенне / Аляксей Пянко // Кобрынскі веснік. – 2004. – 9 кастрычніка. – С. 2.

**Пянко, А**. О яичном порошке, йоде и селене / Алексей Пянко // Кобрынскі веснік. – 2004. – 10 ліпеня. – С. 3.

**Сацук, А**. Одна из лучших в республике / Алексей Сацук // Кобрынскі веснік. - 2004. – 31 студзеня. – С.1,2.

По итогам 2003 г. коллектив Кобринской птицефабрики награжден Почетной грамотой Республиканского объединения «Белптицепром».

**Шапран, Ю**. Яйцо курицу научит / Ю. Шапран // Вечерний Брест. – 2004. – 30 января. – С. 4.

**Пянко, А**. Главное – интересы людей / Алексей Пянко // Кобрынскі веснік. – 2002. – 7 снежня. – С. 3.

2 декабря исполнилось 40 лет Кобринской птицефабрике.

**Максімчык, А.** Добрае кармленне – прадукцыі прыбаўленне / А. Максімчык // Кобрынскі веснік. – 2002. – 11 верасня (№ 84). – С. 2.

Кормавытворчасць на Кобрынскай птушкафабрыцы.

**Максімчык, А.** З уласных крыніц / А. Максімчык // Кобрынскі веснік. – 2002. – 10 жніўня (№ 70-71). – С. 1.

Корманарыхтоўкі птушкафабрыкі.

**Сацук, А.** Пакуль падлічваем затраты / А. Сацук // Кобрынскі веснік. – 2001. – 18 красавіка (№ 32). – С. 3.

Да ААТ «Кобрынская птушкафабрыка» далучаны гаспадаркі – аграфірма «Патрыкі» і калгас «1-е мая».

**Пянко, А**. Лідары ў рэспубліцы / Аляксей Пянко // Кобрынскі веснік. – 2000. – 2 снежня. – С. 1.

Кобрынская птушкафабрыка ўтрымлівае першынство сярод птушкафабрык рэспублікі па прадуктыўнасці курэй-нясушак.

**Язубец, Н**. «Наша задача – добиться стабильных результатов» / Н. Язубец // Кобрынскі веснік. – 1998. – 10 чэрвеня. – С.1,2.

**Сацук, А.** Патрабаванне часу – дысцыпліна вытворчасці / А. Сацук // Кобрынскі веснік. – 1996. – 10 красавіка (№ 28). – С. 2.

Гутарка з дырэктарам птушкафабрыкі А. А. Краўчуком.

**Сацук, А.** Дзейнічае новы цэх / А. Сацук // Кобрынскі веснік. – 1994. – 6 красавіка (№ 27). – С. 3.

**Знаёмцеся: 30-гадовы юбіляр – Кобрынская птушкафабрыка** // Кобрынскі веснік. – 1992. – 2 снежня. – С. 3.

**Кобринской** птицефабрике – 30 лет // Кобрынскі веснік. – 1992. – 20 февраля. – С. 3.

**Сацук, А.** Запрашае «Жар-птушка» / А. Сацук // Кобрынскі веснік. – 1992. – 27 мая. – С. 1.

Адкрыўся фірменны магазін Кобрынскай птушкафабрыкі.

**Пшанічная, Г.** Поспехі птушкаводаў / Г. Пшанічная // Камуністычная праца. – 1980. – 14 жніўня.

**Сацевич, М.** Ищем новые формы / М. Сацевич // Сельская газета. - 1977. - 7 января.

О парторганизации Кобринской птицефабрики.

**Бялова, М.** Працай слаўны чалавек / Марыя Бялова // Камуністычная праца. – 1975. – 24 чэрвеня.

Аб Г. С. Камілеўскай, якая ўзнагароджана ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, іншымі ўзнагародамі.

**Рамченко, Л**. Фабрика яиц / Л. Рамченко // Заря. - 1964. - 25 июля.

**Фабрика яиц** / Л. Арецкер, А. Приходько, В. Татун, А. Тильков // Сельская газета. – 1964. – 27 октября.

О работе Кобринской птицефабрики.

**Мокроус, Н. И.** На нашей межколхозной / Н. И. Мокроус // Сельское хозяйство Белоруссии. – 1962. - № 4. - С. 23.

О работе Кобринской птицефабрики.

Кобрынскі раён
Кобрын
Птушкафабрыка
«Кобрынская птушкафабрыка» ААТ
Птушкагадоўчыя прадпрыемствы
Сельскагаспадарчыя прадпрыемствы